Гапеева, Л. Сын Сенненшчыны / Л. Гапеева // Голас Сенненшчыны. – 2015. – 8 мая. – С. 6.

Герою Савецкага Саюза,
Мацюшову Аляксею Дзмітрыевічу,
ураджэнцу Сенненшчыны, прысвячаецца

Загінуў на Смаленшчыне герой,
Там пахаваны, там яго магіла,
На той зямлі прыняў апошні бой,
У тым баі і куля падкасіла.

Ён тройчы быў паранены ў баях,
Выходзіў не аднойчы з акружэння.
Абраў сабе адзіны верны шлях,
Суровы шлях - Радзімы вызваленне.

Натхняў байцоў на подзвігі заўжды,
Ніколі не пакінуў поля бою.
Населеныя пункты, гарады
Абараняў у баях любой цаною.

І камандзірам смелым, мужным быў,
На поле бітвы з чэсцю ён загінуў.
Радзіме да апошніх сіл служыў,
Таму і памяць вечную пакінуў.

Благаславёна будзе хай яна,
Благаславёна моц яе і сіла,
Свяшчэнная бацькоўская зямля,
Такіх сыноў якая нарадзіла.

Ларыса Гапеева